*З надыходзячым Новым годам, сябры!*

ГАЗЕТА ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ ФРАНЦЫСКА СКАРЫНЫ

# Гомельскі універсітэт

№ 18 (938) | ПАНЯДЗЕЛАК, 29 снежня 1997 г. | Газета заснавана ў верасні 1969 года | Выходзіць два разы ў месяц | Цана дагаворная




## ЗААХВОЧАНЫ ЗА АКТЫЎНУЮ РАБОТУ

24-га снежня ў памяшканні абласнога культурна-асветніцкага цэнтра адбылася ўрачыстая вечарына. Яна была прысвечана 50-годдзю Беларускага таварыства "Веды". З нагоды юбілею гэтай грамадскай арганізацыі выказана шмат цёплых слоў і пажаданняў. Прывітальны адрас уручаны ёй і ад калектыву нашага універсітэта.

За актыўную работу па прапагандзе ведаў Ганаровымі граматамі аблвыканкома ўзнагароджаны загадчык кафедры філасофіі ГДУ доктар філасофскіх навук, прафесар У.М.Калмыкоў, намеснік дэкана гісторыка-юрыдычнага факультэта дацэнт І.В.Нямкевіч, Ганаровай граматай аблсавета -- рэктар універсітэта член-карэспандэнт НАН Беларусі Л.А.Шамяткоў. Кандыдаты навук, дацэнты А.А.Фяськоў з кафедры філасофіі, І.Ф.Эсмантовіч з кафедры гісторыі Беларусі ўдастоены падзячных адрасоў аблвыканкома.

Група лектараў з нашага універсітэта заахвочана ганаровымі падзячнымі граматамі Рэспубліканскай і абласной арганізацый таварыства "Веды".

## ВІНШУЕМ!

*Рэктарат, грамадскія арганізацыі універсітэта, дэканат, выкладчыкі, супрацоўнікі і студэнты фізічнага факультэта горача віншуюць дацэнта кафедры оптыкі **МІЦЮРЫЧА Георгія Сямёнавіча** з паспяховай абаронай дысертацыі на атрыманне вучонай ступені доктара фізіка-матэматычных навук.*

***

*Рэктарат, грамадскія арганізацыі універсітэта, дэканат, выкладчыкі, супрацоўнікі і студэнты філалагічнага факультэта горача віншуюць загадчыцу кафедры беларускай мовы **СТАНКЕВІЧ Аляксандру Аляксандраўну** з паспяховай абаронай дысертацыі на атрыманне вучонай ступені доктара філалагічных навук.*

***

*Рэктарат, грамадскія арганізацыі універсітэта, выкладчыкі, супрацоўнікі і студэнты факультэта фізічнай культуры горача віншуюць аспірантку кафедры АЛФК, старшага выкладчыка кафедры лёгкай атлетыкі і лыжнага спорту **НОВІК Галіну Уладзіміраўну** (навуковы кіраўнік -- дацэнт Н.В.Карташова) з паспяховай абаронай дысертацыі на атрыманне вучонай ступені кандыдата педагагічных навук.*

***

*Калектыў кафедры аздараўленчай і лячэбнай фізічнай культуры горача віншуе аспірантку кафедры **КАЗЛОВУ Валянціну Леанідаўну** (навуковы кіраўнік -- дацэнт Г.І.Нарскін) з паспяховай абаронай дысертацыі на атрыманне вучонай ступені кандыдата педагагічных навук.*

Спяшайцеся!

## НА КАРАГОД ВАКОЛ ЁЛКІ

Няма ў дзетвары свята больш любімага, прыгожага, казачнага, чым Новы год! Яго яна чакае з асаблівай нецярплівасцю, бо ведае, што Дзед Мароз са Снягуркай падаруюць ім прыгожыя цацкі, салодкія ласункі, запрасяць у радасны, вясёлы карагод каля зялёнай лясной прыгажуні. А там можна хлопчыкам і дзяўчынкам свае таленты прадэманстраваць: расказаць цікавы вершык, добрую песеньку праспяваць, станцаваць...

Усё гэта будзе на навагоднім дзіцячым ранішніку ў нашым універсітэце. Дзед Мароз са Снягуркай чакаюць дзятву выкладчыкаў і супрацоўнікаў 2-га студзеня ў вучэбным корпусе N1 (фае актавай залы).

Пачатак -- у 11 гадзін.

**ПРАФКОМ.**

## З УЗНАГАРОДАЙ!

*За шматгадовую навукову і вучэбную работу па падрыхтоўцы маладых спецыялістаў, актыўны ўдзел у грамадскім жыцці і ў сувязі з юбілеем з дня нараджэння доктар філалагічных навук, прафесар кафедры рускага, агульнага і славянскага мовазнаўства **КАЗЛОВА Раіса Міхайлаўна** ўзнагароджана Ганаровай граматай універсітэта.*

# РАСТУЦЬ РАДЫ ВУЧОНЫХ

У першай дэкадзе снежня на працягу двух дзён на пасяджэннях спецыялізаваных саветаў пры нашым універсітэце ішла абарона кандыдацкіх дысертацый.

Спачатку сур'ёзны і прэстыжны экзамен трымалі алгебраісты. Навуковым кіраўніком двух з іх з'яўляўся доктар фізіка-матэматычных навук, прафесар, загадчык кафедры алгебры і геаметрыі ГДУ А.М.Скіба. Выдатны пачын зрабіла яго аспірантка Н.Р.Жаўнова. Прадставіўшы дысертацыю да абароны яшчэ да заканчэння аспірантуры, перад членамі спецыялізаванага Савета яна паказала глыбокія веды ў тэорыі груп, што пацвердзілі яе афіцыйныя апаненты.

Упэўнена трымалася пры абароне дысертацыі і асістэнт кафедры вылічальнай матэматыкі і фізікі Бранскай сельскагаспадарчай акадэміі з Расіі В.М.Рыжык. Яна стала пятай па ліку вучаніцай А.М.Скібы, хто за два апошнія гады пад яго навуковым кіраўніцтвам паспяхова абараніў дысертацыі на атрыманне вучонай ступені кандыдата фізіка-матэматычных навук.

Але, бадай, найбольшую цікавасць у членаў спецыялізаванага Савета і ўсіх прысутных на яго пасяджэнні выклікала абарона дысертацыі, датэрмінова прадстаўленая на прысуд масцітых матэматыкаў





аспірантам члена-карэспандэнта Нацыянальнай Акадэміі навук Беларусі Л.А.Шамяткова грамадзянінам Іарданіі Аль-Шаро Халеда Ахмада. Трэба сказаць, што ў гэтай заходнеазіяцкай краіне беларускія матэматычныя школы і, у прыватнасці, Гомельская алгебраічная, карыстаюцца сапраўдным прызнаннем. Гэта ўжо другі аспірант ГДУ з названай краіны, які выдатна вытрымаў экзамен на атрыманне вучонай ступені па матэматыцы.

На гэты раз афіцыйнымі апанентамі дысертантаў былі шырока вядомыя алгебраісты А.В.Мельнікаў (Мінск), В.А.Вядзернікаў (Бранск), М.Ц.Вараб'ёў (Віцебск), У.М.Семянчук (ГДУ). У якасці апаніруючых арганізацый выступілі Яраслаўскі дзяржуніверсітэт і Інстытут матэматыкі НАН Украіны.

Члены спецыялізаванага Савета аднагалосна прагаласавалі за прысуджэнне ўсім тром дысертантам вучонай ступені кандыдата фізіка-матэматычных навук.

На наступны дзень працаваў пакуль што адзіны ў Рэспубліцы Беларусь спецыялізаваны Савет па спецыяльнасці "Вылічальныя машыны, комплексы, сістэмы і сеткі". Дысертацыі на атрыманне вучонай ступені кандыдата тэхнічных навук абаранялі былыя выпускнікі матэматычнага факультэта ГДУ асістэнт кафедры вылічальнай матэматыкі і праграміравання Л.А.Цурганава (навуковы кіраўнік -- к.т.н., дацэнт В.Я.Быхаўцаў) і старшы навуковы супрацоўнік кафедры матэматычных праблем кіравання А.М.Асіпенка (навуковы кіраўнік -- д.т.н., прафесар І.В.Максімей). Іх афіцыйнымі апанентамі былі доктары тэхнічных навук, прафесары А.А.Малчанаў і З.Л.Рабіновіч з Кіева, к.т.н., дацэнт В.Я.Рабека з Беларускага дзяржуніверсітэта транспарту і кандыдат фізіка-матэматычных навук, с.н.с. С.Ф.Ліпніцкі з Інстытута тэхнічнай кібернетыкі (Мінск), апаніруючымі арганізацыямі -- адпаведна Беларуская дзяржаўная політэхнічная акадэмія і Нацыянальны тэхнічны універсітэт Украіны.

Л.А.Цурганава і А.М.Асіпенка таксама паспяхова вытрымалі адказны экзамен на атрыманне вучонай ступені.

**Б.ВАЛОДЗІН.**

**На здымках: дысертацыі абараняюць Н.Р.Жаўнова і грамадзянін Іарданіі Аль-Шаро Халеда Ахмада.**

**Фота У.Чысціка.**



# СПАБОРНІЧАЛІ ПРАГРАМІСТЫ

Нядаўна ў горадзе на Няве -- Санкт-Пецярбургу быў праведзены паўфінал студэнцкага каманднага першынства свету па праграміраванню. Усяго сёлета ў турніры ўдзельнічала 77 каманд ВНУ Расіі, Беларусі, блізкага і далёкага замежжа, у тым ліку і Нюрнбергскага універсітэта (Германія).

Гомельскі дзяржаўны універсітэт імя Ф.Скарыны на гэтых вельмі прэстыжных міжнародных спаборніцтвах быў прадстаўлены дзвюма камандамі матэматычнага факультэта. У першую з іх уваходзілі Андрэй Галацін, Ігар Ганчарэнка, Данііл Дзегцяроў, Ігар Коршунаў, у другую -- Вячаслаў Краўцоў, Павел Нігерыш, Вячаслаў Налягач, Аляксандр Талкачоў. Сярод іх было двое пяцікурснікаў і столькі ж першакурснікаў, астатнія -- студэнты другога курса. Іх узначальваў кандыдат тэхнічных навук, дацэнт кафедры матэматычных праблем кіравання, начальнік інфармацыйна-вылічальнага цэнтра ГДУ М.С.Далінскі. Ён і паведаміў аб некаторых выніках паўфінала першынства свету.

Кожнай камандзе на 5 гадзін было выдадзена на англійскай мове 8 задач і па аднаму камп'ютэру. Пераможцай стала першая каманда Санкт-Пецярбургскага універсітэта, якой аказаліся па сілах чатыры задачы. На адну менш рашылі каманды Маскоўскага дзяржаўнага універсітэта імя М.В.Ламаносава і Уральскага тэхнічнага універсітэта. Абедзьве каманды ГДУ справіліся з дзвюма задачамі і былі вельмі блізкімі, каб рашыць трэцюю. У канчатковым выніку II каманда гамяльчан заняла 15-е месца і атрымала спецыяльны сертыфікат, якіх удастоены 16 мацнейшых каманд. Толькі на адно месца ніжэй аказалася ў турнірнай табліцы першая каманда праграмістаў нашага універсітэта.

Калі ж разглядаць паказчыкі паўфінала 1997/98 года па суме дзвюх каманд ад ВНУ, дык нашы студэнты ўступілі толькі Санкт-Пецярбургскаму дзяржуніверсітэту, МДУ і Санкт-Пецярбургскаму інстытуту дакладнай механікі і оптыкі.

Варта нагадаць, што на аналагічных спаборніцтвах мінулага года каманды ГДУ занялі 33-е і 38-е месцы. Прагрэс пераканаўчы. І гэта сведчыць аб высокім узроўні спецыяльнай падрыхтоўкі нашых студэнтаў на матэматычным факультэце (дэкан -- дацэнт У.В.Арлоў), якія спецыялізуюцца на кафедры матэматычных праблем кіравання (загадчык -- д.т.н., прафесар І.В.Максімей). А паколькі касцяк абедзьвюх каманд складалі студэнты малодшых курсаў, у будучым пры плённай працы яны могуць разлічваць яшчэ на больш значны поспех.



# НЕЗАБЫЎНЫ ТЫДЗЕНЬ У КЛЕРМОН-ФЕРАНЕ

**Нядаўна група з дзесяці студэнтаў-правазнаўцаў нашага універсітэта пабывала ў Францыі, у горадзе Клермон-Феране. Па запрашэнню юрыдычнага факультэта Овернькага універсітэта яна праходзіла там навучанне. Я быў адзін з дзесяці шчаслівчыкаў і хачу падзяліцца сваімі ўражаннямі аб паездцы.**

Перш за ўсё неабходна выказаць падзяку ўсім тым, дзякуючы каму гэта паездка адбылася. Нямала для гэтага зрабілі прэзідэнт Оверньскага універсітэта пан Дамінік Цюрпэн, дэкан юрыдычнага факультэта пан Жан-П'ер Масьяс, рэктарат ГДУ.

... Трое сутак у дарозе -- гэта зусім нямала, нягледзячы на тое, што ехалі мы ў прасторным і зручным аўтобусе універсітэцкіх "Радзімічаў". Усе рабяты і я, зразумела, таксама выглядалі стомленымі пасля няблізкага шляху . Аднак стомленасць як рукой зняло, калі мы пад'ехалі да горада Клермон-Ферана.

Мне ён спадабаўся з першага позірку. Клермон-Феран мала чым нагадвае Гомель з яго шырокімі прамымі вуліцамі і шматпавярховымі будынкамі. Архітэктура горада захавалася яшчэ з часоў сярэдневякоўя: вузкія вулачкі і невысокія, але вельмі прыгожыя дамы. Усё гэта суседнічае з ультрасучаснымі гандлёвымі цэнтрамі і офісамі ў цэнтральнай частцы горада. Клермон-Феран можна па праву назваць горадам тысячы фантанаў, кожны з якіх не падобны на іншыя і нагадвае твор мастацтва.

Што асабліва здзівіла і спадабалася ўсім нам, дык гэта тое, што з многіх фантанаў можна піць і вада з іх вельмі смачная і валодае лекавымі ўласцівасцямі. Так што калі вам надарыцца выпадак трапіць у Клермон-Феран, абавязкова прыхапіце з сабой які-небудзь сасуд, каб пакаштаваць гэтай вады.

Сам горад размешчаны як быццам у цэнтры катлавана, акружаны непрыступным бастыёнам з гор і таму там вельмі рэдка дзьме вецер. Круглы год у ім даволі цёплае надвор'е. Непадалёку ад горада размясціўся -- што б вы думалі? -- сапраўдны вулкан! Праўда, дзякуй Богу, вельмі даўно патухлы. Цяпер аб тым часе, калі ён дзейнічаў, нагадвае толькі незвычайны чорны колер некаторых будынкаў горада -- застылая лава вулкана аказалася выдатным будаўнічым матэрыялам.

Адной з галоўных адметнасцей г.Клермон-Ферана з'яўляецца гарадскі парк. Ён хаця і намнога меншы па памерах за гомельскі, але не менш прыгожы, дагледжаны і акуратны. Як вядома, асаблівае захапленне ў наведвальнікаў нашага парку выклікаюць белыя лебедзі, а жыхары Клермон-Ферана не менш увагі ўдзяляюць цюленю, які плавае ў невялікім басейне прама ў сярэдзіне парка.

Жыхары Клермон-Ферана вельмі ганарацца сваімі знакамітымі землякамі. Калі вы заблукалі ў горадзе, дарогу дапамогуць знайсці невялічкія металічныя таблічкі з відарысам вучонага-фізіка Паскаля, якія ўманціраваны прама ў маставую. Для мяне вельмі цікава было даведацца, што ў Клермоне ёсць помнік Урбану Другому, які паклаў пачатак крыжовым паходам. Я нават адчуў нейкае хваляванне, калі стаяў на тым самым месцы, адкуль крыжаносцы ўпершыню адправіліся ў свой доўгі шлях.

Гасцей з Беларусі ў Клермон-Феране прынялі выдатна. Усіх нас, акрамя кіраўніка, размясцілі ў студэнцкім інтэрнаце. Трэба адзначыць, што інтэрнаты ў Францыі маюць назвы, а не проста нумары, як у нас. Інтэрнат, дзе жылі мы, насіў нязвычную для нашага вуха, але прыгожую назву "Ройс Ом Дом".

Усім нам было забяспечана трохразовае бясплатнае харчаванне: раніцай у буфеце інтэрната, днём і вечарам -- у студэнцкім рэстаране. Студэнцкі рэстаран -- гэта своеасаблівы харчовы мегаполіс, дзе адначасова ядуць, напэўна, звыш тысячы студэнтаў. Паесці французы любяць смачна, гэта мы адчулі па якасці прапануемых страў. Адзіным недахопам французскай кухні, аб якім мы шкадавалі, аказалася поўная адсутнасць супоў і баршчоў, да якіх мы прывыклі.



А цяпер пра тое, што з'явілася асноўнай прычынай нашай кароткай тыднёвай паездкі. На яе працягу ў нас былі заняткі па канстытуцыйнаму , міжнароднаму гуманітарнаму праву, праву Еўрапейскага таварыства. Таксама мы прымалі ўдзел у вельмі цікавым семінары, прысвечаным Канстытуцыйным судам Беларусі, Расіі і Украіны. У Клермон-Феран былі запрошаны суддзя ўкраінскага Канстытуцыйнага суда У.Мартыненка, В.Зоркін з Расіі і былы старшыня Канстытуцыйнага суда нашай рэспублікі В.Ціхіня. На жаль, прадстаўнік Расіі прыехаць не змог, але семінар усё роўна атрымаўся вельмі цікавым і пазнавальным для нас.

Усе нашы заняткі праходзілі ў форме дыскусіі. Доказам таго, што яны выклікалі вялікую цікавасць усіх гомельскіх студэнтаў, можа служыць іх працяглasць -- замест запланаваных паўтары гадзіны яны звычайна працягваліся на гадзіну больш.

Нам вельмі запамятаўся прыём у мэрыі Клермон-Ферана, наладжаны ў гонар нашага прыезду. З прывітальнымі прамовамі да нас звярталіся першыя асобы горада. У адказ выступіў Ігар Віктаравіч Нямкевіч, які, дарэчы, выдатна справаўляўся са сваімі абавязкамі кіраўніка дэлегацыі на працягу ўсёй паездкі. У мэрыі нам уручылі падарункі на памяць аб г.Клермон-Феране: рукзакі, тэніскі і бралкі. Акрамя таго мы атрымалі бейсболку з відам горада, якую, калі прыехалі дамоў, урачыста ўручылі дэкану нашага факультэта Міхаілу Іванавічу Старавойтаву.

Цяжка забыць вечарынку, якую наладзіла ў сябе дома ў гонар свята маладога віна "Божолс" адна з аспірантак Оверньскага універсітэта. Разам з намі туды былі запрошаны рабяты з многіх краін, якія вучацца ў Клермон-Феране. Ну, скажыце, дзе яшчэ можна ў адзін вечар паразмаўляць з французамі пра іх выдатнае віно і сыр, з італьянцамі -- пра футбол, з аўстрыйцамі пра іх родны горад Лінце, з немцамі пра складанасці іх роднай мовы?

Так, добра было ў Клермон-Феране, застаецца толькі пашкадаваць, што наша знаходжанне там было непрацяглым па часе, ды пазайздросціць студэнтам Франка-Беларускага інстытута кіравання, якія маюць магчымасць вучыцца там на працягу года.

Але ж спадзяемся, што і на нашай вуліцы будзе свята. Тым больш, што пачатак першым кантактам паміж юрыдычным факультэтам універсітэта Клермон-Ферана і гісторыка-юрыдычным факультэтам ГДУ пакладзены.

**Вячаслаў СМІРНОЎ,**
**студэнт гр.П-53**
**гісторыка-юрыдычнага**
**факультэта.**

**На здымку: гомельскія студэнты на прыёме ў дэкана факультэта права і эканамічных навук універсітэта Овернь (Клермон-1).**

Сацыяльная абарона

# ШТО МАЕМ, ТЫМ ДАПАМАГАЕМ

У адыходзячым годзе рэктарат і прафсаюзны камітэт вялікую ўвагу ўдзялялі ўдасканаленню сістэмы матэрыяльнага стымулявання працы работнікаў ГДУ, узмацненню матэрыяльнай зацікаўленасці прафесарска-выкладчыцкага саставу, спецыялістаў, служачых і рабочых у выкананні пастаўленых перад намі задач на высокім узроўні, выяўленню і выкарыстанню наяўных рэзерваў, дыферэнцыруемаму падыходу да матэрыяльнага заахвочвання работнікаў універсітэта.

За творчыя і вытворчыя дасягненні ў працы, выкананне асабліва важных (тэрміновых) работ, складанасць і напружанасць працы 169 выкладчыкам і 172 спецыялістам і служачым, што складае 31 працэнт штатнай колькасці работнікаў універсітэта, устаноўлены персанальныя надбаўкі да пасадавых акладаў. Чатыром рабочым, якія тарыфікуюцца па разрадах, устаноўлены надбаўкі за прафесійнае майстэрства.

На выплату надбавак у 1997 годзе было выкарыстана 942 мільёны рублёў, у тым ліку 900 мільёнаў руб. -- з рэспубліканскага бюджэту, 42 млн. -- за кошт пазабюджэтнай дзейнасці.

На штомесячнае прэміраванне супрацоўнікаў універсітэта па выніках вучэбнай, вучэбна-метадычнай, навуковай і арганізацыйна-гаспадарчай дзейнасці за высокую якасць і эфектыўнасць выконваемай работы са сродкаў рэспубліканскага бюджэту было выкарыстана 2655 мільёнаў руб., 55 млн.руб. выкарыстана з прыбытку па пазабюджэтнай дзейнасці.

Такім чынам, на матэрыяльнае заахвочванне прафесарска-выкладчыцкага саставу, спецыялістаў, служачых і рабочых універсітэта (надбаўкі, прэміі) было накіравана 3652 млн.руб., што складае 13,5 працэнтаў планавага фонду заработнай платы па бюджэту.

З мэтай аказання сацыяльнай падтрымкі работнікам універсітэта, улічваючы адставанне сярэдняй заработнай платы бюджэтнай сферы ў параўнанні з сярэдняй заработнай платай рабочых і служачых па рэспубліцы, штомесячна адрасна выплачвалася матэрыяльная дапамога супрацоўнікам на набыццё медыкаментаў і ўзмоцненае харчаванне ў перыяд праходжання курса лячэння, у сувязі з нараджэннем дзяцей і юбілейнымі датамі, на пахаванне, у сувязі з надзвычайнымі абставінамі. Рэгулярна аказваецца матэрыяльная дапамога ўдзельнікам Вялікай Айчыйнай вайны, ветэранам працы, шматдзетным сем'ям, адзінокім маці і ўдовам, супрацоўнікам, якія маюць у ёй асабліва вострую патрэбу. На ўказаныя мэты сёлета было зрасходавана 1512,8 млн.руб., у тым ліку 937,8 млн.руб. -- за кошт сродкаў рэспубліканскага бюджэту, 575,0 млн.руб. -- за кошт сродкаў па пазабюджэтнай дзейнасці.

Матэрыяльная дапамога, выплачаная работнікам універсітэта ў снежні, складаецца з 500 000 руб. (за кошт прыбытку па пазабюджэтнай дзейнасці ГДУ) і са 170 000 руб -- за кошт сродкаў дзяржбюджэту.

**С.ПАШУК,**
**начальнік планава-фінансавага аддзела.**

# ЗВАНОЧАК ДАБРЫНІ

... Пад зіхатлівай прыгажуняй-ёлачкай сярод мноства цацак утульна размясціўся забаўны лялечны Дзед Мароз. У яго руках -- маленькі званочак, які сваёй мелодыяй клікаў, прываблівау усіх, хто знаходзіўся ў гэты час у выставачнай зале універсітэта, і тых, хто яшчэ не ведаў, што тут адбываецца. І апошнія з зацікаўленасцю накіроўваліся сюды, дзе ўрачыста адкрывалася дабрачынная ёлка ў рамках традыцыйнай акцыі "Нашы сэрцы -- дзецям", якая штогод праводзіцца ў нашай рэспубліцы напярэдадні навагодніх святаў.

Студэнты ГДУ, будучыя педагогі, хто вывучае этыку і эстэтыку, праходзяць спецыялізацыю "Арганізацыя і методыка пазашкольнай і пазакласнай работы", пастаянна становяцца актыўнымі ўдзельнікамі гэтай акцыі. Яны рыхтуюць розныя падарункі для хлопчыкаў і дзяўчынак, якія жывуць у дзіцячых дамах, дамах-інтэрнатах, і пазбаўленых мацярынскай пяшчоты, для хворых дзяцей, з малазабяспечаных сем'яў. Да іх далучаюцца і вучні школ горада, у прыватнасці, СШN16 і СШ N44. Розныя цацкі, кніжкі, творы выяўленчага мастацтва трапляюць сюды, да дабрачыннай ёлкі, а потым адрасоўваюцца па прызначэнню.

На адкрыцці дабрачыннай ёлкі ва універсітэце выступіла старшыня абласнога аддзялення Беларускага дзіцячага фонду Л.Семяніцкая, якая выказала падзяку студэнтам ГДУ за іх дабрыню і спагаду, а таксама іх нястомнаму кіраўніку ў гэтай высакароднай справе дацэнту кафедры філасофіі Т.П.Гаранінай.

Дзед Мароз і Снягурка прымалі шматлікія падарункі ад студэнтаў, школьнікаў, прадстаўнікоў творчых арганізацый горада.

Прафком універсітэта ўнёс свой грашовы ўзнос для дзяцей, абдзеленых шчаслівым лёсам. Яго атрымаюць выхаванцы Рэчыцкага дома-інтэрната. Прафком студэнтаў набыў для хлопчыкаў і дзяўчынак, якія выхоўваюцца ў Журавіцкім доме-інтэрнаце, забаўнага Дзеда Мароза са званочкам, аб якім гаварылася вышэй.

Выкладчыкі, супрацоўнікі, усе жадаючыя могуць таксама ўнесці свой пасільны ўклад у добрую справу. Дабрачынная ёлка ва універсітэцкай выставачнай зале будзе дзейнічаць да 15 студзеня.

**Т.НІКАЛАЕВА.**

# ТРЭБА АБ'ЯДНАЦЦА

Бядотнае становішча народаў пасля распаду былога СССР яшчэ ў большай ступені ўскладніла і падарвала давер да навукі і вучоных. Іх прэстыж упаў настолькі, што далейшае захаванне такога стану можа паставіць рэспубліку ў разрад недаразвітых краін. Сёння дзяржаўныя чыноўнікі, якія маюць доступ да крыніц фінансавання і іх размеркавання, адмахваюцца нават ад тых вучоных, якія прапаноўваюць свае распрацоўкі і паслугі па больш эфектыўнаму выкарыстанню матэрыяльных і грашовых сродкаў у народнай гаспадарцы. Большасць жа так званых "вытворчых фірм" займаецца купляй-перапродажам (па сутнасці -- спекуляцыяй). Ім не да навукі.

Адной з умоў па выхаду з такога крызіснага стану з'яўляецца аб'яднанне вучоных розных спецыяльнасцей у адзіную маналітную сістэму, якую прапаноўвае ажыццявіць абласны Савет Беларускага навукова-тэхнічнага саюза (БелНТС). Асноўная ідэя такога аб'яднання накіравана на тое, каб даць афіцыйным структурам выканаўчай улады і грамадскасці шырокую і бясплатную інфармацыю аб навуковых распрацоўках і дасягненнях кожнага вучонага нашай вобласці, якія маюць асабліва практычную накіраванасць.

Ажыццявіць такую задуму можна шляхам выдання кнігі, сааўтарам якой можа стаць кожны вучоны, які пажадае абнародаваць свае асабістыя дасягненні ў той ці іншай навуцы шляхам апісання тых распрацовак, якія яшчэ не ўкаранёны на практыцы або маюць вялікую каштоўнасць на сённяшні дзень з перспектывай іх рэалізацыі.

Мы лічым, што ў калектыве Гомельскага дзяржуніверсітэта імя Ф.Скарыны знойдуцца вучоныя і даследчыкі, якія адгукнуцца на гэту ідэю і падрыхтуюць адпаведны матэрыял для будучай кнігі. Для фарміравання яе асноўных раздзелаў просьба да 1-га лютага 1998 года прадставіць нам прозвішчы вучоных і навукова-практычную накіраванасць іх дасягненняў у той ці іншай галіне ведаў па адрасу г.Гомель, вул.Кірава, 17, Бел НТС.

Маючы такую кнігу, любы адукаваны і перспектыўны кіраўнік, які думае больш аб інтарэсах народа, чым аб сваіх асабістых справах, будзе сам шукаць "нашага брата".

**І.МІРАНОВІЧ,**
**старшыня абласнога Савета Гомельскага аддзялення Беларускага навукова-тэхнічнага саюза, кандыдат хімічных навук, дацэнт.**



# КАБ ПАМЯТАЦЬ, ХТО МЫ І АДКУЛЬ...

У беларускіх народных строях, пры адпаведным інтэр'еры на працягу трох снежаньскіх дзён першакурснікі філалагічнага факультэта ладзілі ў студэнцкіх аўдыторыях і актавай зале інсцэніроўкі фальклорных святаў -- Купалле, Каляды, Масленіца. Гэта было цікавае тэатралізаванае відовішча, якое давала гледачам нагляднае ўяўленне аб распаўсюджаных на Беларусі народных абрадах. Так паказвалі на практыцы, як засвоілі тэарэтычны курс па фальклору, які выкладае ім дацэнт кафедры беларускай літаратуры В.С.Новак, будучыя настаўнікі.

Нездарма кажуць: "Той трывала стаіць на зямлі, у каго ёсць спадчына". Ашчадна яе захоўваць -- задача будучых педагогаў, якім прывіваць любоў у дзяцей да роднай мовы, роднай культуры. Яны добра разумеюць гэтую сваю высакародную задачу -- клапаціцца аб захаванні фальклорных скарбаў як канцэнтрацыі лепшых думак народа, чыстай крыніцы нашай мовы, каб памятаць, хто мы і адкуль.

За вокнамі зімовае снежнае хараство, а сюды, у аўдыторыю, дзе інсцэніравалася свята Купалля, нібыта цёплае, ласкавае сонейка зазірнула. Як быццам летам павеяла ад маляўнічага дзеяння, што разгарнулася на вачах гледачоў: быццам убачылі яны наяве прыгожую папараць - кветку, якая зацвітае ў лясным гушчары ў дзень летняга сонцастаяння і прыносіць шчасце таму, хто яе знойдзе, вадзяных німф -- русалак, купалаўскае вогнішча, што запальвае ў сэрцах людзей агонь памяці, духоўнасці, які закладзены ў старажытных звычаях і абрадах, песнях і легендах, казках і гульнях.

Свята атрымалася цікавым, вобразным, дзякуючы стараннасці ўсіх яго ўдзельнікаў -- студэнтаў гр. Б-11, а асабліва Ірыны Пятрук, Людмілы Самойленка, Вольгі Мягковай, Галіны Драбышэўскай, Аксаны Кавалёвай, Марыны Голуб, Ларысы Непша і інш.

Наступнае свята -- Каляды, якое падрыхтавалі студэнты гр. БА-13, атрымалася па-асабліваму адметным, таму што паказана было ў актавай зале ГДУ і яго змагла ўбачыць вялікая колькасць гледачоў. А яшчэ -- на ім прысутнічалі жаданыя, ганаровыя госці -- рускія, украінскія, беларускія літаратары. Так атрымалася, што запланаваная раней сустрэча з імі супала з мерапрыемствам студэнтаў-філолагаў. І гэта ўнесла ў яго асаблівую атмасферу. Рускім і ўкраінскім гасцям было асабліва цікава ўбачыць беларускую абраднасць.

... На сцэне -- упрыгожаная вясковая хата, на сталах, засціланых вышыванымі абрусамі, розныя стравы, пачастункі. Гаспадары чакаюць прыходу галоўных герояў свята -- калядоўшчыкаў, пераапранутых у цыганоў, а таксама ў казу, іншых жывёл. Хвалююцца першыя, каб не абмінулі іх двара калядоўшчыкі, інакш, як лічыцца, не будзе ладу ў іх гаспадарцы. З песнямі, жартамі, музыкай заходзяць тыя ў хату і чуюцца віншаванні са святой Калядой. А далей пачынаюцца яшчэ больш цікавыя моманты свята -- тэатралізаваная гульня "Жаніцьба Цярэшкі", у час якой выбраныя "маці" і "бацька" з многіх хлопцаў і дзяўчат адбіраюць адну пару і "жэняць". У час "вяселля" адбываецца шмат абрадавых яго момантаў -- з абавязковай дзяльбой каравая і пажаданнямі гасцей маладым усяго самага найлепшага ў іх сумесным жыцці.

Вельмі натуральна, на ўздыме выконвалі тут свае ролі студэнты Кацярына Хазей, Ганна Мельнік, Вольга Шпанькова, Алена Зайчанка, Ірына Вейлер, Ігар Бадуноў, Ірына Купрэенка, Вольга Прышчэпа, Кацярына Свярдлова, Таццяна Кузьмянкова, Таццяна Лемешава. У стварэнні сапраўднай святочнай атмасферы ім дапамагалі А.Г.Шпанькоў, музычны кіраўнік вакальна-харэаграфічнага калектыву "Гомій", і яго кіраўнік , а таксама балетмайстар П.І.Свярдлоў.



На здымку: фрагмент свята Каляды.

Фота У.Чысціка.

Калі пасля заканчэння інсцэніроўкі на сцэну запрасілі гасцей-паэтаў, тыя не маглі стрымаць сваёй узрушанасці ад убачанага, імі была дадзена высокая ацэнка імкненню будучых філолагаў далучыць моладзь да роднага беларускага слова, да народных традыцый. Сакратар Гомельскага аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі Васіль Ткачоў, які вёў сустрэчу, адзначыў вялікую каштоўнасць традыцыйных сустрэч прадстаўнікоў творчай інтэлігенцыі трох славянскіх народаў. У іх, нягледзячы на сённяшнія мытні і межы, застаецца шмат агульнага, што робіць іх братэрства яшчэ больш моцным.

Студэнцкая моладзь з цікавасцю слухала выступленні ўкраінскіх гасцей -- кіраўніка Чарнігаўскай пісьменніцкай арганізацыі Станіслава Рап'яха, Міколы Малага, Пятра Куцэнкі, якія чыталі пераклады з беларускай мовы, свае ўласныя вершы. З Расіі прыехаў Мікалай Пасноў, са сталіцы нашай рэспублікі прыбылі намеснік галоўнага рэдактара часопіса "Полымя" Алесь Пісьмянкоў, рэдактар газеты "Белорусская лесная газета", былы выпускнік філфака ГДУ Анатоль Зэкаў. Прыйшлі на сустрэчу да студэнтаў гомельскія аўтары Таіса Мельчанка, Лідзія Возісава, Мікалай Яромін, Юрый Фатнеў, Уладзімір Жытнікаў. У паэтычных радках, што гучалі са сцэны, -- лірызм і пяшчота вечнага чалавечага пачуцця кахання, бязмежная любоў да роднага краю, боль і трывога за лёс нашай роднай беларускай мовы. Шчыры смех і гарачыя апладысменты выклікалі пародыі, прачытаныя іх аўтарам А.Зэкавым. А словы, сказаныя А.Пісьмянковым, запалі ў душу студэнцкай моладзі асабліва: "Мы верым, што наша беларуская мова будзе жыць, нягледзячы ні на новых палітыкаў, ні на новыя партыі".

Слушнасць такой думкі пацвердзіла чарговае свята, паказанае студэнтамі гр. Б-12, -- Масленіца. Яна суправаджалася адпаведнымі песнямі, адметнымі звычаямі, адным з якіх з'яўляецца "цяганне калодкі" незамужняй дзяўчынай ці нежанатым хлопцам, гульнямі ("у паву")і, канешне, частаваннем масленічнымі блінамі. Іх, дарэчы, самімі студэнтамі было шмат нарыхтавана. Імі, разам з іншымі пачастункамі, што знаходзіліся на сталах, змаглі паласавацца і госці свята.

Фальклорныя інсцэніроўкі беларускіх святаў атрымаліся, як кажуць, на славу. Поспех гэтых мерапрыемстваў забяспечылі не толькі самі першакурснікі, але і тыя, хто ім дапамагаў, -- намеснік дэкана філфака па выхаваўчай рабоце Л.П.Кузьміч, старшы выкладчык кафедры беларускай літаратуры В.С.Генаш, студэнтка гр.БА-23 Святлана Каган.

Тры цікавыя святы-спектаклі пацвердзілі, што студэнты працуюць з фальклорным матэрыялам не эпізадычна, не толькі ў час летняй практыкі, а мэтанакіравана. Значыць, беларускім абрадам жыць і адраджацца!

**Т.ДУБЯК**

## ЖЫВЕМ НАДЗЕЯЙ

Напярэдадні Новага года многія адчуваюць своеасаблівы пагранічны стан сваёй асобы. Кожны, у каго жыве надзея на лепшае, шчыра імкнецца выкарыстаць урачыстую фармальнасць змены календароў для таго, каб прыйсці ў новае вымярэнне жыцця абноўленым.

Дзеці і бюракраты ў які ўжо раз абяцаюць, што яны больш не будуць...

Жанчыны востра адчуваюць сваю прыналежнасць да зоркавай сферы і з вялікай зацікаўленасцю гартаюць гараскопы, спрабуючы даведацца -- што год наступны ім рыхтуе...

Публіка больш практычная ганяецца за прыгожымі календарамі, якія адрозніваюцца палепшанай паліграфічнай якасцю, за часопісамі мод і самымі праверанымі плёткамі аб чарговым павышэнні цэн...

Трэба быць вельмі сумным чалавекам, каб без разумення аднесціся да ўсёй гэтай мітусні. Больш таго, не патрабуецца асаблівай праніклівасці, каб убачыць пэўную карысць, якую прыносяць чалавеку такія заняткі. Прага абнаўлення -- моцны матыў, і да яго варта аднесціся з павагай.

## НАВАГОДНІЯ ЗАМАЛЁЎКІ З ЯПОНІІ

Новы год у Японіі святкуюць тры дні запар. Гэта не проста пачатак новага календарнага цыкла, але і своеасаблівая кропка адліку, шанс пачаць жыццё нанава. Справа ў тым, што ў адным з сінтаіцкіх храмаў г.Нара пры вялікай колькасці народу адбываецца абрад ачышчэння ад грахоў: жрацы б'юць вялізным драўляным білам у спецыяльны звон. Кожны ўдар знішчае адзін з грахоў: а ўсяго іх, па традыцыі, сто восем (108). Пры апошнім удары мінулагодняя грахі японцаў адыходзяць у небыццё -- і народ становіцца чыстым перад багамі (як у біблейскай традыцыі пры ахвяры "казла адпушчэння"). Цяпер можна святкаваць са спакойнай душой.

●●●

На Новы год звычайна наносяць візіты знаёмым і падносяць падарункі. Часам гэта прымае казусныя формы. Расказваюць, што нейкі скупы прынёс свайму суседу саломінку і сказаў: "Зрабі сабе люльку, куры і ўспамінай мяне, свайго старога сябра". Сусед быў не меншым скнарай, і калі прыйшоў з адказным візітам, паднёс палавіну той жа саломінкі і сказаў: "Вось табе каштоўнае лякарства ад рэўматызму. Прыкладзі да паясніцы -- і табе стане лепш."

●●●

У сучасным Токіо напярэдадні Новага года раскупляюць масу білетаў на прыгарадныя паязды да станцый Шчасце, Вялікія грошы, Грашовая скрынка і г.д. Чыгуначнікі ведаюць, што пасажыраў не павялічыцца: проста ўвайшло ў моду падносіць сябрам і знаёмым білеты нібыта ў шчаслівую будучыню.




●●●

Надыходзіць год Тыгра. Людзей, якія нарадзіліся ў гэтым годзе -- пад такім знакам -- вызначаюць неразважлівасць, гарачнасць, захопленасць, энтузіязм. У старой Японіі пры гэтым лічылася, што жанчына, народжаная ў год Тыгра, прыносіць няшчасце і заўчасную смерць свайму мужу, таму бедныя "тыгрыцы", як правіла, былі вымушаны ўсё сваё жыццё праводзіць у адзіноце або паступалі ў публічны дом (таму "абнаўленне" кадраў у такіх установах звычайна адбывалася раз у дванаццаць гадоў). На шчасце, у XX стагоддзі былі ўнесены карэктывы: цяпер лічыцца, што "тыгрыца" прынясе шчасце мужу Дракону або Каню, а вось яе шлюб з Быком, Змяёй ці Малпай будзе нешчаслівым.

●●●

Японцы надаюць вялікую ўвагу дванаццацігадоваму цыклічнаму "звярынаму" гараскопу: у прыватнасці, без супастаўлення гараскопаў нармальныя людзі партнёра для шлюбу не выбіраюць. Прадказанням па традыцыі надаецца вялікае значэнне. І трэба сказаць, што ўсходні гараскоп намнога больш дакладны, чым задыякальны еўрапейскі. Справа ў тым, што рэальна знакаў Задыяка налічваецца трынаццаць, а не дванаццаць (гэта ведалі яшчэ астраномы старажытных майя). У канцы 1994 г. Каралеўскае астранамічнае таварыства Вялікабрытаніі пасля стараннай праверкі апублікавала рэальны задыякальны цыкл сонечнага календара, у які ўвайшло дадаткова сузор'е Змеяносец, на фоне якога праходзіць сонечны шлях (экліптыка) у канцы лістапада -- сярэдзіне снежня. Выглядае ён наступным чынам:

**Вадалей** 16 студзеня -- 11 сакавіка

**Рыба** 12 сакавіка -- 18 красавіка

**Авен** 19 красавіка -- 13 мая

**Цялец** 14 мая -- 20 чэрвеня

**Блізняты** 21 чэрвеня -- 19 ліпеня

**Рак** 20 ліпеня -- 9 жніўня

**Леў** 10 жніўня -- 15 верасня

**Дзева** 16 верасня -- 30 кастрычніка

**Шалі** 31 кастрычніка -- 22 лістапада

**Скарпіён** 23 лістапада -- 29 лістапада

**Змеяносец** 30 лістапада -- 17 снежня

**Стралец** 18 снежня -- 18 студзеня

**Казярог** 19 студзеня -- 15 лютага.

На жаль, нашы еўрапейскія астролагі рэальнага Задыяка выкарыстоўваць не хочуць, не звяртаючы ўвагі на той факт, што традыцыйны падыход проста не адпавядае сітуацыі і таму дае масу памылак у прагнозах. Ды і Змеяносцам крыўдна: пакуль няма характарыстыкі іх дамінуючых рыс і рэкамендацый да выбару шлюбнага партнёра. А "звярыны" 12-гадовы ўсходні каляндар не мяняецца і яго прадказанні, мяркуючы па вопыту аўтара і яго знаёмых, намнога больш дакладныя. Асабліва падыходзяць нам у Беларусі гараскопы японскія (або непальскія). Можна гэтаму верыць, можна не -- але штосьці ў гэтым ёсць.

**Інфармацыю перадаў па пэйджэру наш пазаштатны ўласны карэспандэнт дзесьці ў Японіі К.ЛАПКІН.**





## ТАКІ ЎЖО ЗВЫЧАЙ...

... Перад Новым годам неабходна аддаць усе даўгі, дараваць усе крыўды і папрасіць за іх прабачэння. Выкінуць з дому ўвесь разбіты посуд, пазбавіцца ад прадметаў, якія нагадваюць аб непрыемнасцях мінулага года.

... Навесці чысціню ў доме, разабраць усе куткі, працерці шкло і люстэркі, каб зіхацелі.

... У Малдавіі ў першы дзень Новага года абавязкова раскідваюць у сябе і ў тых дамах, куды ідуць у госці, зерне: каб год быў урадлівым, заможным, каб дом быў поўнай чашай. У Латвіі тое ж самае сімвалізуе гарох -- сустракаючы Новы год, трэба абавязкова з'есці хаця б адну гарошыну... У Грузіі ў першы дзень Новага года не прынята хадзіць у госці без запрашэння: гаспадар сам заве тых, з кім у яго звязана паняцце дабра, -- такі госць павінен першым у Новым годзе пераступіць парог дома, куды яго паклікалі, прычым абавязкова прынесці салодкія ласункі. А ў Арменіі трэба ў гэты дзень павіншаваць усіх старэйшых родзічаў.

Пры ўсёй разнастайнасці ў аснове ўсіх гэтых звычаяў і традыцый -- падсвядомае жаданне "задобрыць" Новы год, каб ён быў паспяховым, шчаслівым для ўсёй сям'і, прынёс у дом радасць.

## ТОЛКОВЫЙ СЛОВАРЬ ДЕДА МОРОЗА

**Ау-у-у** -- сигнал неопытного студента.

**Варварство** -- художественная резьба и писание на стульях, стенах, подоконниках и потолках аудиторий, лабораторий, в туалетах и др.

**Великодушие** -- черта характера, которая лучше всего воплощается в старосте группы, скрывающем прогульщика.

**Вода** -- форма материи, без которой не могут быть полноценными ответы студентов на экзаменах.

**Гений** -- студент, изучивший всю дополнительную литературу.

**Гроши** -- остатки стипендии после возвращения долгов кредиторам.

**Жертва** -- студент, не сумевший во время экзамена обмануть преподавателя.

**Знакомый** -- человек, близкий настолько, чтобы вы могли одолжить у него деньги, но не настолько, чтобы ему одалживали.

**Знаток** -- студент, который знает все и вся, только не в изучаемой им области. Чаще всего это первокурсник.

**Кризис** -- последняя неделя до выплаты стипендии.



**Лентяй** -- студент, который все время собирается что-то делать.

**Маньяк** -- студент, хронически болен ненормальной тягой к науке.

**Мафия** -- тайная организация списывания (ТОС).

**Мертвые души** -- студенты на последней лекции.

**Мозг** -- орган, которым думаем, что думаем.

**Осадки** -- студенты, оставленные повторять тот же курс.

**Ответ** (правильный) -- приятная неожиданность, на которую преподаватель меньше всего надеется.

**Отличник** -- луч света в темном царстве.

**Практика** (продолжительная) -- многократная пересдача того же самого экзамена.

**Профессор** -- это студент, сдавший все(!!!) экзамены.

**Работа** -- универсальное понятие. По-студенчески звучит так:"Без работы тяжело, но мы трудностей не боимся!"

**Реферат** -- списанный какой-либо доклад и преподнесенный студентом в качестве собственного.

**Семестр** -- скучноватый промежуток времени между двумя каникулами.

**Стипендия** -- оплата за страх во время экзаменов.

**Экзамен** -- это спор, в котором рождается не истина, а оценка.

## СМЯШЫНКІ-СНЯЖЫНКІ

Габравец пытаецца ў сваёй жонкі:

-- Што б ты хацела атрымаць у падарунак да Новага года?

-- Не ведаю.

-- Добра, даю табе на разважанне яшчэ адзін год.

●●●

Навагодняя раніца.

-- Куды ідзеш?

-- Я шукаю кватэру.

-- Як, у цябе няма кватэры?

-- Ёсць, але не памятаю дзе...

●●●

Муж і жонка рыхтуюцца да сустрэчы Новага года. Жонка крычыць з іншага пакоя:

-- Дарагі, ты нават не ўяўляеш, які цудоўны падарунак я табе падрыхтавала!

-- Дык пакажы хутчэй.

-- Зараз, я ўжо апранаю.



З усмешкай

## ПРА СВЯТОЧНАЕ ЗАСТОЛЛЕ

***(Некалькі рэкамендацый ад Дзеда Мароза і Снягурачкі)***

• Каб да прыходу гасцей Ваш святочны стол "ломился от яств", падпілуйце ў яго ножкі.

• Калі за святочным сталом у вас нечакана ўпалі на падлогу нож ці відэлец, не трэба іх шукаць. Ветліва пацікаўцеся ў суседа: "Гэта не на Ваш бумажнік я выпадкова наступіў?" І калі лёгкаверны палезе пад стол, спакойна забярыце яго прыбор. Этыкет захаваны.

• Асноўная праблема некаторых гасцей (асабліва мужчын) або гасцінных гаспадароў -- куды падзець рукі? Пакласці на стол нельга, пазбавіцца ад іх непрыкметна для акружаючых немагчыма... Ёсць адзін варыянт: пакладзіце іх на калені. Трэба толькі загадзя выбраць на чые іменна.

• Для імгненнага прыгатавання піццы дастаткова купіць маленькі піражок з любой начынкай і як мага больш непрыкметна пакласці яго на стул вашай немалых габарытаў цешчы, свякрухі і г.д.




Святочныя сюрпрызы

## ПАДАРУНКІ АТРЫМЛІВАЦЬ ПРЫЕМНА

***На Новы год прынята дарыць падарункі. Ніхто не павінен у гэтую ноч заставацца без сюрпрыза, няхай і не надта дарагога па кошту, але абавязкова з выдумкай, сэнсам.***

У кожнай краіне, у розных народаў ёсць наконт падарункаў свае традыцыі. У Кітаі, напрыклад, ні ў якім разе нельга дарыць на Новы год гадзіннікі, каб не нагадваць аб хуткаплыннасці часу, а з ім і жыцця... У Японіі такі традыцыйны падарунак каханай, як букет кветак, дазваляецца падносіць толькі вельмі вядомым, высокапастаўленым людзям. А для англічан лепшым "падарункам" будзе прыход у дом у якасці "першай нагі Новага года" цёмнавалосага мужчыны з кавалкам вугалю для дамашняга ачага і галінкай амелы, якая сімвалізуе даўгалецце. У Грэцыі запрошаныя на сустрэчу Новага года нясуць з сабой абымшэлы камень, скідваюць яго каля парога і кажуць: "Няхай багацце гаспадара будзе такім жа важкім, як гэты камень!".

****************************************

## А ШТО АБЯЦАЮЦЬ НАМ ЗОРКІ?

Па ўсходняй сістэме знакаў Задыяка, прынятай у японскім календары, 1998 год -- год Тыгра. Гэты год будзе не зусім спакойным. Прыглядзьцеся да змен у жыцці, але будзьце асцярожнымі. У палітычных адносінах у перспектыве вялікія змены. Нечаканая палітычная развязка. Рэвалюцыя. Год, спрыяльны для перамен, для дзеянняў.

**ПАЦУК** -- Ён не адчувае сябе ў баспецы, няхай займаецца тым, што датычыць яго.

**БЫК** -- Ён будзе спакойным, раз'юшаным, небяспечным. Большай часткай будзе заставацца ў сабе, чакаючы лепшых дзён.

**ТЫГР** -- Можа рабіць, што захоча. Яму шанцуе. Няхай ён возьмецца за вялікія справы. Ён будзе абаронены.

**КОТ** -- Наш сямейны чалавек не любіць перамен, якія б парушылі яго спакойны лад жыцця.

**ДРАКОН** -- Гэта яму падабаецца. І ён знойдзе спосаб вызначыцца... і быць прадстаўленым да ўзнагароды.

**ЗМЯЯ** -- Якое стамляльнае жыццё. Але з усяго гэтага Змяя атрымлівае ўрок.

**КОНЬ** -- Магчыма, выкарыстае гэты год, каб пайсці ад бацькоў або ад свайго спадарожніка. Ва ўсялякім разе, нейкія змены будуць.

**КАЗА** -- Усе занятыя тым, каб змяніць свет, і забываюцца пра яе. Ёй будзе сумна.

**МАЛПА** -- Яна пражыве гэты год у якасці гледача. У яе пачуццё бескарыснасці дзеяння.

**ПЕВЕНЬ** -- Усё мяняецца... Як сумна... Як гэта непрыемна... Які суровы год!

**САБАКА** -- Нарэшце, выпадак для самаахвяравання. Сабака ў сваёй стыхіі. Ён будзе шчаслівы.

**СВІННЯ** -- Змены... Яна прыстасоўваецца. І таму што з'яўляецца велікадушнай, спакойна церпіць усе ўзрушэнні.



СНЕЖНАЕ ЦАРСТВА. Фота У.ЧЫСЦІКА.

спорт спорт спорт спорт спорт спорт

## ЁСЦЬ З КАГО БРАЦЬ ПРЫКЛАД!

У спорткомплексе "Гомсельмаш" прайшоў чэмпіянат Беларусі па пауэрліфтынгу (сілавому трохбор'ю).

Знамянальна, што на гэтым чэмпіянаце два прадстаўнікі нашага універсітэта ўпершыню выканалі нарматыў "Майстар спорту Рэспублікі Беларусь".

Удастоены гэтага звання другакурснік факультэта фізічнай культуры Дзмітрый Глухотка і яго трэнер -- старшы выкладчык кафедры фізвыхавання і спорту Уладзімір Галавач. Важна падкрэсліць, што Уладзімір Аляксандравіч выканаў майстарскі нарматыў у ... 47 гадоў! Вось дзе маладзецкая ўдаласць, вось з каго студэнты могуць браць прыклад.

Хочацца пажадаць нашым асілкам больш высокіх дасягненняў у спорце ў надыходзячым 1998 годзе.

## ПЕРАМОГА ПЕРШАКУРСНІКА

У г.Рэчыцы прайшоў Кубак Гомельскай вобласці па плаванню. Першакурснік факультэта фізічнай культуры Аляксандр Сайдакар тройчы ўзнімаўся на вышэйшую прыступку п'едэстала гонару пасля заплываў на дыстанцыях: 200 м брасам -- 2.25,0 сек, 400 м комплексным плаваннем -- 4.50,0 сек, 100 м брасам -- 1.06,9 сек.

**В.МАРЧАНКА.**

****************************************

**ГОМЕЛЬСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ імя Ф.Скарыны**

аб'яўляе конкурс на замяшчэнне вакантных пасад па кафедрах:

-- гісторыі Беларусі -- загадчыка кафедры, дацэнта;
-- матэматычных праблем кіравання -- ст.выкладчыка;
-- геаграфіі -- загадчыка кафедры.

Тэрмін падачы заяў -- не пазней 1 месяца з дня апублікавання паведамлення.

Заявы накіроўваць на адрас: 246699, г.Гомель, вул.Савецкая, 104.

**РЭКТАРАТ.**

Рэктарат, грамадскія арганізацыі, увесь калектыў універсітэта выказваюць глыбокае спачуванне прарэктару па вучэбнай і выхаваўчай рабоце **ВОІНАВУ Мікалаю Мікалаевічу** ў сувязі з напаткаўшым яго горам -- смерцю **БАЦЬКІ**.

Аўтары надрукаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць прыведзеных фактаў, цытат, эканамічных даных, асабістых імён, геаграфічных назваў і іншай інфармацыі, а таксама за тое, каб у матэрыялах не ўтрымлівалася даных, якія не падлягаюць адкрытый публікацыі. Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы ў парадку абмеркавання, не раздзяляючы пункту гледжання аўтара.

ЗАСНАВАЛЬНІК -- Гомельскі дзяржаўны універсітэт імя Ф.Скарыны.

Наш адрас: 246699, г. Гомель, вул. Савецкая, 104, пакой 1-18, тэл. 57-43-21.
Рэгістрацыйны № 263

Спонсар газеты -- прафком студэнтаў.

Газета набрана і звёрстана на настольна-выдавецкім комплексе ІВЦ ГДУ, аддрукавана на фабрыцы "Паліграфдрук", г.Гомель, вул. Савецкая, 1.

Рэдактар Ул.П. БАЛОГА

Аб'ём 1 друк. арк.
Тыраж 1.000 экз.
Заказ 501.
Падпісана да друку 21.12.97.